3. Эйдельман, А.Я. “Революция сверху” в России/ А.Я. Эйдельман // Наука и жизнь. – 1988. № 11 – С. 71- 84.
4. Павленко, Н., Андреев, Н., Кобрин,В., Федоров В. История России с древнейших времен до 1861года / Н. Павленко, Н. Андреев, В. Кобрин, В. Федоров. – М.: Высшая школа, 1998. – 576 с.
5. Багдановіч, А.І. Фарміраванне ідэалагічных інстытутаў Расійскага самадзяржаўя ў XVIII – пачатку XIX стст. / А.І. Багдановіч // Гісторыка-археалагічны зборнік НАН Беларусі. Выпуск 25. – Мінск, 2010. – С. 30 – 34.
6. Булгарин, Ф. Воспоминания / Ф. Булгарин. – М.: Захаров, 2001. – 279 с.

# ЗАРАДЖЭННЕ ПАРАСТКАЎ ПАРТНЁРСКІХ АДНОСІН У ПРАЦОЎНАЙ СФЕРЫ БЕЛАРУСІ НА МЯЖЫ XIX – XX СТСТ.

Дубовік А.А.г. Мінск, БНТУ

Адным з асноўных тыпаў сацыяльна-працоўных адносін з'яўляецца партнёрскі, заснаваны на іх дагаворным рэгуляванні з улікам інтарэсаў усіх бакоў. Зараджэнне партнёрскіх адносін у працоўнай сферы адносіцца да канца XIX – пачатку XX стст. і было абумоўлена новымі рэаліямі, якія праявіліся ў развіцці капіталізму ў парэформеннай Беларусі. У гэты перыяд складваюцца пэўныя механізмы ўзаемадзеяння ў сістэме «дзяржава – прадпрымальнікі – рабочыя»; выпрацоўваецца фабрычна-заводскае заканадаўства, якое вызначала меру ўмяшальніцтва ўрада ў сферу працоўных адносін і адказнасці прадпрымальнікаў за жыццядзейнасць рабочых. Для нагляду за выкананнем фабрычнага заканадаўства і захаваннем парадку на прадпрыемствах у 1882 г. у Расіі, услед за еўрапейскімі краінамі, была заснавана фабрычная інспекцыя з чыноўнікаў Міністэрства фінансаў (у далейшым – Міністэрства гандлю і прамысловасці). Але ёй падпарадкоўваліся толькі цэнзавыя прадпрыемствы – тыя, што мелі не менш, чым 30 рабочых або не менш, чым 16 рабочых пры наяўнасці механічнага рухавіка [1, с. 212].

Парасткі сацыяльнага партнёрства фарміраваліся ў гэты перыяд па двух накірунках: узаемадзеянне гаспадароў і рабочых у

працэсе вытворчасці і як удзел прадпрымальнікаў у вырашэнні праблем умоў працы і побыту рабочых. Закон ад 3 чэрвеня 1886 г. «Аб найме рабочых на фабрыкі, заводы і мануфактуры і аб узаемных адносінах фабрыкантаў і рабочых» уводзіў правілы, згодна з якімі «гаспадар з нанятымі павінен абыходзіцца справядліва і лагодна, патрабаваць ад іх толькі працы, абумоўленай па дагавору або той, для якой найм учынены, плаціць ім дакладна і ўтрымліваць спраўна» [2]. Па гэтаму закону ўзаемныя адносіны прадпрымальнікаў і рабочых з патрыярхальных павінны былі ператварыцца ў дзелавыя, заснаваныя на свабодзе працоўнага дагавора. Фабрыкант павінен быў заключыць пісьмовы дагавор з рабочым у форме разліковай кніжкі ўстаноўленага ўзору. Належала ўказваць тэрмін найму, устаноўлены памер заработнай платы, кошт пражывання ў фабрычных казармах, запісваць усе дадзеныя аб заробках і спагнаннях, накладзеных на рабочых. Фабрычная адміністрацыя абавязвалася прадастаўляць фабрычнаму інспектару звесткі аб расцэнках работ, якія пасля зацвярджэння даводзіліся да ведама рабочых. Забаранялася зніжаць заработную плату, мяняць колькасць рабочых дзён у тыдзень і колькасць рабочых гадзін, правілы працы раней заканчэння тэрміну дагавораў або без папярэджання за 2 тыдні для рабочых, нанятых на неакрэслены тэрмін. Наймальнікі пазбаўляліся права разлічвацца з рабочымі замест грошай хлебам, харчамі, таварамі і купонамі. Выдача заработнай платы рабочым назначалася не радзей 1 – 2 разоў у месяц, прычым з заробку нельга было ўтрымліваць даўгі і рабіць недазволеныя вылічэнні. Гаспадар прадпрыемства меў права накладваць спагнанні на рабочых, але выключна дысцыплінарнага характару, якія не павінны былі служыць пакрыццём страт.

У адпаведнасці з законам 1886 г. былі заснаваны ў губернях фабрычныя прысутнасці, якім было прадастаўлена права выдаваць абавязковыя пастановы ў галіне аховы працы, медыцынскага абслугоўвання рабочых з улікам мясцовых умоў. Згодна закону ад 7 чэрвеня 1899 г. аб стварэнні Галоўнай па фабрычных і горназаводскіх справах прысутнасці, у кампетэнцыю ствараемых губернскіх устаноў уваходзіла выданне абавязковых палажэнняў, накіраваных на развіццё і прымяненне да мясцовых умоў правілаў, устаноўленых Галоўнай прысутнасцю. Асабліва важнае значэнне, на погляд расійскага фабрычнага інспектара і пісьменніка

У.П. Літвінава-Фалінскага, мела прыняцце 10 чэрвеня 1903 г. закона, па якім рабочыя атрымалі права на выбранне фабрычных старастаў як прадстаўнікоў сваіх інтарэсаў перад адміністрацыяй прадпрыемстваў [3, с. 91].

Аўтары чацвёртага тому «Гісторыі Беларусі» адзначаюць: «У прамысловасці і на транспарце Беларусі існавалі розныя ступені эксплуатацыі, умоў працы і жыцця рабочых: ад самых жорсткіх да даволі ліберальных, што не саступалі лепшым заходнееўрапейскім узорам сацыяльнай палітыкі і сацыяльнага партнёрства таго часу» [1, с. 211–212]. Сапраўды, у канцы XIX ст. былі выпадкі правядзення наймальнікамі разумнай сацыяльнай палітыкі. Найбольш яскравым прыкладам яе ў сацыяльна-працоўнай сферы стала ўвядзенне ў маі 1894 г. на Добрушскай папяровай фабрыцы па ініцыятыве дырэктара-распарадчыка Стульгінскага А.І. 8-гадзіннага працоўнага дня «з узаемнаю карысцю як для працадаўцы, так і для рабочага» [4, с. 30–31]. Прычым, як адзначаў Стульгінскі А.І. у напісанай ім брашуры, «рабочыя ў вышэйшай ступені добрасумленна выконваюць прынятыя на сябе абавязацельствы ўзамен змяншэння працоўнага дня» [5, с. 12]. Не выключана, што прыняццю рашэння аб увядзенні 8-гадзіннага працоўнага дня папярэднічала абмеркаванне новаўвядзення з рабочымі або, магчыма, нават заключэнне калектыўнага пагаднення. Таму можна разглядаць дадзены выпадак як прыклад сацыяльнага партнёрства паміж наймальнікам і рабочымі. Вядома, што пры Добрушскай фабрыцы былі адчынены бальніца і аптэка, правам бясплатнай медыцынскай дапамогі і бясплатнымі лекамі карысталіся не толькі рабочыя, але і члены іх сем’яў. Наяўнасць аптовага складу тавараў першай неабходнасці дазваляла рабочым набываць іх на 15-20% танней, чым у мясцовых крамах. Пры фабрыцы дзейнічалі школа з чатырохгадовым курсам навучання, ашчадная каса, існавалі хор і духавы аркестр [4]. Але, на жаль, Стульгінскі А.І. не быў тыповай фігурай айчыннага прадпрымальніка пачатку XX ст.

Працэс фарміравання адносін сацыяльнага партнёрства набыў новыя арганізацыйныя пачаткі ў сувязі з узнікненнем прафсаюзаў. У Беларусі яны пачалі стварацца раней, чым у цэнтральных губернях Расійскай імперыі – у сярэдзіне 90-х гг. XIX ст. [6, с. 5]. Прафсаюзы актыўна ўключыліся ў барацьбу за эканамічныя правы працоўных: скарачэнне працягласці працоўнага

дня, павышэнне аплаты працы, ліквідацыя штрафаў, паляпшэнне ўмоў працы. Самадзяржаўе спрабавала ўзяць рабочы рух пад свой кантроль праз дазвол на легалізацыю рабочых саюзаў, дзейнічаючых пад наглядам паліцыі. Адным з цэнтраў «зубатаўшчыны» быў Мінск. Тут у маі 1901 г. «зубатаўцы» ўмяшаліся ў стачку слесараў і з дапамогай начальніка губернскага жандармскага ўпраўлення Васільева М.В. прымусілі наймальнікаў зменшыць працягласць працоўнага дня. Гэта прыцягнула на бок «зубатаўцаў» многіх рамесных рабочых: у створаную Яўрэйскую незалежную рабочую партыю перайшлі з Бунда 15 з 20 прафсаюзаў [7, с. 140]. Аднак у далейшым з-за незадаволенасці наймальнікаў уладам прыйшлося адмовіцца ад метадаў «паліцэйскага сацыялізму». Расійскі даследчык Мядзведзеў С. адзначае, што ў Мінску «абурэнне фабрыкантаў выклікала прымушэнне іх заключаць калектыўныя дагаворы і прысваенне саюзамі заканадаўчай улады, якое выражалася ў выданні абавязковых пастаноў, рэгулюючых адносіны гаспадароў і рабочых. Галоўнае ж абвінавачванне, выстаўляемае прамыслоўцамі супраць саюзаў, заключалася ў арганізацыі працоўных забастовак» [8].

У ходзе буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі, якая пачалася ў студзені 1905 г., актыўныя выступленні рабочых і прафсаюзаў прымусілі царскі ўрад прыняць 4 сакавіка 1906 г. «Часовыя правілы аб грамадствах і саюзах», якімі дазвалялася ствараць саюзы наёмных рабочых на прамысловых і гандлёвых прадпрыемствах для ўзгаднення і абароны эканамічных інтарэсаў, паляпшэння ўмоў працы і быту, а таксама саюзы ўладальнікаў прадпрыемстваў для абароны інтарэсаў наймальнікаў. Тым самым была створана арганізацыйная аснова для трохбаковых адносін у сацыяльна-працоўнай сферы: наймальнікі – наёмныя работнікі – дзяржава. На думку некаторых сучасных даследчыкаў, менавіта ўказ ад 4 сакавіка 1906 г., які з’яўляўся безумоўнай заваёвай Першай рускай рэвалюцыі, фактычна паклаў пачатак станаўленню інстытута сацыяльнага партнёрства ў Расіі [9, с. 134]. Была ажыццёўлена легалізацыя калектыўных працоўных правоў – права на кааліцыю, права на забастоўку як сродак абароны калектыўных інтарэсаў; праведзена заканадаўчая рэгламентацыя пытанняў стварэння і дзейнасці прафесійных суполак працаўнікоў і наймальнікаў. Перагаворы з наймальнікамі вяліся прадстаўнікамі

прафсаюзаў, пасрэднікамі на іх нярэдка выступалі фабрычныя інспектары як прадстаўнікі дзяржавы.

Яшчэ да рэвалюцыі ў канцы 1904 г. у Баку прадстаўнікамі рабочых і нафтапрамыслоўцамі ў выніку ўсеагульнай стачкі быў падпісаны першы ў Расійскай імперыі калектыўны дагавор, які атрымаў назву «мазутнай канстытуцыі». Аднак выпадкі заключэння калектыўных дагавораў у той час былі адзінкавымі. У 1905–1907 гг. у Расійскай імперыі было заключана не больш 25 калектыўных дагавораў, галоўным чынам у паліграфічнай вытворчасці, у наступныя гады – яшчэ менш [9, с. 122]. Асноўнай перашкодай для іх заключэння была адмова прадпрымальнікаў, асабліва ў буйной прамысловасці, прызнаваць за прафсаюзамі, з прычыны іх нешматлікасці, права прадстаўляць усіх рабочых прадпрыемства або галіны вытворчасці.

Факты заключэння калектыўных дагавораў у дарэвалюцыйнай Беларусі не ўпамінаюцца ў гістарычнай літаратуры. Разам з тым, безумоўна, калектыўныя перамовы вяліся і прымаліся кампрамісныя рашэнні. Так, вядома, што кантора машынабудаўнічага завода Вячэрэка А. ў Гродзенскай губерні згадзілася на перагляд расцэнак пасля перамоў з выбарнымі ад рабочых [11, с. 285]. Не выключана, што мелі месца факты заключэння не толькі вусных, але і пісьмовых калектыўных пагадненняў.

Зараджэнню сацыяльнага партнёрства садзейнічалі таксама развіццё кааператыўнага руху, арганізацыя акцыянерных таварystваў. Аднак адносіны сацыяльнага партнёрства ў дарэвалюцыйнай Беларусі не атрымалі распаўсюджвання. У гэты перыяд пераважаў канфліктны тып сацыяльна-працоўных адносін.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. у краіне пачала замацоўвацца практыка калектыўна-дагаворных адносін у сацыяльна-працоўнай сферы. З’явіліся прыміральныя камеры як асаблівая форма ўзаемаадносін наймальнікаў, прафсаюзаў і дзяржавы. У іх склад уваходзіла роўная колькасць прадстаўнікоў ад рабочых і ўладальнікаў прадпрыемстваў. Галоўнымі задачамі гэтых органаў былі разбор працоўных канфліктаў, выпрацоўка ўзгодненых рашэнняў паміж прадпрымальнікамі і прафсаюзамі пры кантролі з боку дзяржавы.

Такім чынам, фарміраванне сістэмы сацыяльнага партнёрства ў Рэспубліцы Беларусь мае свае гістарычныя перадумовы, вывучэнне якіх дазваляе глыбей зразумець гістарычную пераемнасць дадзенай сацыяльнай з'явы.

Выкарыстаная літаратура

1. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2000–2005. – Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX стст.) / М. Біч [і інш.]. – 519 с.

2. ПСЗ – III, СПб, 1888, Т. VI, № 3769.

3. Литвинов-Фалинский, В.П. Фабричное законодательство и фабричная инспекция. Изд. 2-е, испр. и доп. / В.П. Литвинов-Фалинский. – М., 1904.– 372 с.

4. Киштымов, А.Л. Добрушская бумажная фабрика: опыт социальной политики директора-распорядителя А.И. Стульгинского (80-е гг. XIX в. – 1915 г.) /.А.Л. Киштымов // Предпринимательство в Белоруссии. – 2000. – № 7. – С. 29-31.

5. Стульгинский, А.И. Восьми и девятичасовой труд на Добрушской писчебумажной фабрике князя Паскевича / А.И. Стульгинский. – СПб., 1895. – 14 с.

6. Дубовик, А.К. Из истории возникновения профсоюзов Беларуси (конец XIX – начало XX вв.) /А.К. Дубовик // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2003. – № 2. – С. 4-11.

7. Бич, М.О. Рабочее движение в Белоруссии в 1861-1904 гг. / М.О. Бич. – Минск: Наука и техника, 1983. – 278 с.

8. Медведев, С. Сотрудники Зубатова в Минске (1901–1903): рабочие и полиция против революционеров и капиталистов / С. Медведев [Электрон. ресурс]. – Рэжым доступу: // http: // www. google /ru /Zapadrus.za / zaprus / istbl / 297-1901-1903. – Дата доступу: 14.11. 2011.

9. Морозов, В.Б. К истории становления социального партнерства в России в 1905-1917 годах / В.Б. Морозов // Известия Российского государственного педагогического университета им. А.И. Герцена. – 2007. – Том 8. – № 41. – С. 119-126.

10. Озеров, И. Политика по рабочему вопросу России за последние годы (по неизданным документам) / И. Озеров. – М., 1906. – 322 с.